**Н. А. Лінькова,** *саіскальнік*
*вучонай ступені кандыдата навук*
*установы адукацыі*
*«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».*
Навуковы кіраўнік – **В. А. Грачова**,
*кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт,*
*дацэнт кафедры псіхалогіі і педагогікі ўстановы адукацыі*
*«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

# АДЛЮСТРАВАННЕ ВОБРАЗАЎ ГІСТОРЫІ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ Ў ТВОРЧАСЦІ БЕЛАРУСКІХ МАСТАКОЎ САВЕЦКАГА ПЕРЫЯДУ

Тэма гісторыі нацыянальнай культуры, імкненне да пазнання культурна-гістарычных з’яў заўсёды мелі важнае значэнне ў культуры розных краін, аб’ядноўвалі вакол сябе духоўныя пошукі і культурна-сацыяльныя памкненні грамадства, шырока адлюстроўваліся ў мастацтве. Гэта тэндэнцыя заўсёды найбольш яскрава выяўлялася ў жанры партрэта, бо адлюстраванне чалавечай постаці, раскрыццё характару асобы здаўна лічыцца ў мастацтве справай вельмі адказнай і пачэснай.

Гісторыя беларускай культуры ў партрэтным жывапісе савецкага перыяду (1922–1991) прадстаўлена імёнамі многіх дзеячаў, якія зрабілі вялікі ўклад у фарміраванне культурнага асяроддзя нашай краіны. Важнае месца ў творчасці беларускіх жывапісцаў і графікаў у гэты час сталі займаць вобразы асветнікаў – Францыска Скарыны, Ефрасінні Полацкай, Кірылы Тураўскага, Сімяона Полацкага; а таксама нацыянальных герояў – князёў Усяслава Чарадзея, Вітаўта і Альгерда, герояў нацыянальна-вызваленчага руху К. Каліноўскага і Т. Касцюшкі, паэтаў М. Багдановіча, Янкі Купалы, Якуба Коласа, мастакоў І. Хруцкага, Я. Драздовіча і інш.

З найбольшай паўнатой гэта тэндэнцыя знайшла выраз у звароце да выявы Ф. Скарыны. Жывапісная Скарыніяна, пачатак якой паклалі ў 1920-е гг. працы Я. Кругера і Я. Драздовіча, атрымала далейшае развіццё ў канцы 1950-х гг. у творах А. Кроля, В. Кухарава і І. Ахрэмчыка [4, с. 230].

У 1960–1980-я гг. над гэтай тэмай працавалі П. Сергіевіч, У. Стэльмашонак, Л. Шчамялёў, А. Марачкін і інш. Напрыклад, народны мастак Беларусі У. Стэльмашонак напісаў

шэраг партрэтаў прадстаўнікоў беларускай культуры: Якуба Коласа, Францыска Скарыны, Кірылы Тураўскага, Пятра Мсціслаўца і інш.

Мастак Я. Ждан, заслужаны дзеяч культуры Беларусі, таксама зрабіў шэраг твораў-прысвячэнняў асветнікам і святым, такім як Францыск Скарына (1990), св. Ефрасіння Полацкая (1991), св. Лаўрэнцій Тураўскі (1991), св. Соф'я Слуцкая (1991), св. князь Расціслаў (1991) і інш. Вывучаючы гісторыю, жыццё і дзейнасць вялікіх гуманістаў, асветнікаў, вялікіх мастакоў, паэтаў, кампазітараў, Яўген Ждан працуе над стварэннем партрэтнай галерэі беларускіх дзеячаў культуры і мастацтва мінулых стагоддзяў. Сярод іх Мікола Гусоўскі, Сымон Будны, Адам Міцкевіч, Станіслаў Манюшка, Максім Багдановіч, Янка Купала, Якуб Колас [2, с. 16].

Да культурных вытокаў свайго народа неаднаразова звяртаецца ў творах і заслужаны дзеяч мастацтваў БССР У. Савіч. Мастак дабіваецца ў пэўным сэнсе эфекту зрушэння часу, калі дзеячы беларускай культуры і дзяржаўнасці, што жылі ў мінулых стагоддзях, паўстаюць перад вачыма як сучаснікі. Выпрацоўваючы сваю вобразную мову, ён абапіраецца на падмурак традыцый. Партрэты Уладзіміра Савіча вельмі падобны на іконы. У сфарміраваным вобразным ладзе мастака выразна выказана сучаснае разуменне ўладкаванасці еўрапейскай культуры, заснаванай на хрысціянскай парадыгме [1, с. 19]. У цэнтры кожнага з яго палотнаў старанна прапісана знакамітая асоба з мінулага, а вакол – асяроддзе, якое надае сэнс намаляванаму, фарміруе сукупны вобраз.

Разгледзім працэс папулярызацыі нацыянальнай спадчыны і гісторыі развіцця культуры Беларусі ў творах мастакоў тыражнай і арыгінальнай графікі. Акрамя партрэта, увага надаецца і іншым жанрам выяўленчага мастацтва.

Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР, народны мастак Беларусі Г. Паплаўскі працаваў у галіне станковай і кніжнай графікі. Сярод яго станковых твораў трэба адзначыць серыі «Мой край» (1969), «Белы кантынент» (1970), «Высокае неба» (1971–1980), якія апяваюць прыгажосць роднага краю і беларускага народа, распавядаюць пра засваенне космасу. Сярод работ у кніжнай графіцы: афармленне твораў Янкі Купалы, Якуба Коласа, А. Куляшова, В. Быкава [6].

Вельмі выразна тэму гісторыі культуры Беларусі ў нацыянальным ключы раскрывае вядомы беларускі графік У. Басалыга. Для яго твораў характэрны сувязь з традыцыямі беларускага народнага мастацтва і яркая дэкаратыўнасць. Галоўнымі тэмамі творчасці з'яўляюцца тыя, якія звязаны з нацыянальнай культурай, традыцыйным бытам, народнымі вераваннямі, беларускай мовай (серыя «Мова наша родная»), архітэктурай (цыкл «Помнікі дойлідства Беларусі», 1977–1920 гг.).

Вобразы гісторыі культуры знайшлі адлюстраванне і ў манументальным і манументальна-дэкаратыўным мастацтве. Трэба адзначыць тое, што з'яўленне новых твораў манументальнага жывапісу ў савецкі перыяд прэзентуецца ў сродках масавай інфармацыі, чаго пасля 1991 г. ужо не назіралася. У савецкі час такога кшталту падзеі былі навідавоку ў сувязі з адкрытымі мастацкімі саветамі, сістэмай мастацкіх камбінатаў, гэтага патрабаваў існуючы ідэалагічны ўклад.

Мазаіка – адзін з самых распаўсюджаных відаў манументальна-дэкаратыўнага мастацтва СССР [5]. Пано з керамікі і смальты сустракаюцца паўсюдна на абшарах краін былога СССР. Многія з іх прысвечаны ідэалогіі таго часу і поўнасцю адпавядаюць інтарэсам кіруючай партыі. Аднак, нягледзячы на агульную ідэю і лінію развіцця, у вялізнай шматнацыянальнай дзяржаве можна ўбачыць самабытнасць кожнага народа. Вельмі цікава разглядаць рысы той ці іншай культуры праз мастацтва. Часам творы майстроў даюць уяўленне аб тым, дзе яны з'явіліся, як, кім і калі былі створаны. У творчыя працы ў поўнай меры перацякаюць навакольнае асяроддзе, традыцыі, побыт і перажыванні мастака. У мазаічных карцінах знаходзяць адлюстраванне нацыянальныя касцюмы, характэрныя асаблівасці эканамічнага і культурнага жыцця [Там жа]. Часта героі мазаік увасабляюць узорнага савецкага грамадзяніна. У кожнага народа, нягледзячы на палітычныя межы і ўзаемаадносіны, існуюць свае этнічныя асаблівасці, нацыянальны каларыт, традыцыі. Усё гэта атрымлівае адлюстраванне ў культуры і мастацтве, узбагачаючы сусветную спадчыну непаўторнымі творамі. У савецкіх рэспубліках можна было сустрэць пано, якія нясуць ідэю агульнасці народаў. Такія сюжэты гавораць аб міры і садружнасці краін, агульнай гісторыі, агульных святах і традыцыях.

Вядучы гаворку аб манументальным мастацтве, нельга абмінуць асобу А. Кішчанкі, аднаго з самых вядомых мастакоў Беларусі XX ст. Аўтар сотняў твораў у жанры станковага і манументальнага мастацтва таксама выдатна валодаў тэхнікамі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (кераміка, габелен). Сярод зробленага заслужаным дзеячам мастацтваў і народным мастаком БССР у савецкі перыяд асабліва вылучаюцца мазаічнае пано «Партызаны» на фасадзе гасцініцы «Турыст» у г. Мінску і чатыры пано «Горад-воін», «Горад навукі», «Горад культуры» і «Горад-будаўнік» на тарцах жылых будынкаў па праспекце Незалежнасці ў Мінску [3]. Працы А. Кішчанкі, створаныя ім як у савецкі час, так і пасля, увайшлі ў скарбніцу нацыянальнага мастацтва, сталі здабыткам айчыннай культуры.

Такім чынам, вывучэнне эвалюцыі адлюстравання вобразаў гістарычнай і культурнай памяці беларусаў у межах мастацкай культуры савецкага перыяду дазваляе вылучыць уяўленні аб каштоўнасцях, эстэтычных катэгорыях, этнакультурнай ідэнтычнасці нашага грамадства. Адзначым, што такія працэсы адбываліся з пачатку XX ст. і ў яго апошнія дзесяцігоддзі. Рашэнне праблемы культурнай самаідэнтыфікацыі Беларусі ў савецкай культурнай прасторы стала рухаючай сілай для многіх прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі краіны.


*1.* Владимир Савич : альбом. – М. : Галарт, 2013. – 215 с. – (Мастера изобразительного искусства стран СНГ, Белорусский союз художников).

*2.* Евгений Ждан. Жизнь в искусстве : альбом / сост. Е. И. Ждан ; вступ. ст. П. М. Сапотько. – Несвиж : Несвиж. тип. им. С. Будного, 2014. – 178 с.

*3.* Кищенко А. М. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://artdk.by/painter/kischenko/. – Дата доступа: 15.02.2023.

*4. Медвецкий, А. В.* Портретная живопись Беларуси / А. В. Медвецкий, С. В. Медвецкий. – Витебск : ВГУ им. П. М. Машерова, 2017. – 336 с.

*5.* Национальные краски в советских мозаичных панно [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://ceramicadecor.ru/blog/kraski-sovetskoy-mozaiki/. – Дата доступа: 10.03.2023.

*6.* Неизвестное об известном белорусском графике Георгии Георгиевиче Поплавском [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://gallery.polotsk.museum.by/node/49541. – Дата доступа: 01.03.2023.